АРК

# Весці БДПУ

Штоквартальны навукова-метадычны часопіс.
Выдаецца з чэрвеня 1994 г.

№ 1(55) 2008

СЕРЫЯ 2.
Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія.
Эканоміка. Культуралогія

**Галоўны рэдактар**

П. Дз. Кухарчык

**Рэдакцыйная калегія:**

В. В. Бушчык (*нам. галоўнага рэдактара*)
Л. М. Давыдзенка
А. В. Данільчанка
А. П. Жытко
М. М. Забаўскі
Л. М. Каранеўская (*адк. сакратар*)
І. В. Катляроў
П. В. Кікель
Г. А. Космач
Н. І. Кунгурава
А. М. Люты
У. А. Мельнік
А. І. Смолік
С. В. Снапкоўская

Весці БДПУ
сер 2. №1 2008

## Змест

## Гісторыя

*Сакалоў М.К.* Станаўленне аспіранцкай формы падрыхтоўкі навукова-педагагічных кадраў у вышэйшых навучальных установах Беларусі ........ 3
*Пуцік У.С.* Нацыянальнае пытанне ў праграмах і дзейнасці палітычных партый на тэрыторыі Беларусі (на мяжы XIX–XX ст.) ........ 6
*Волкава В.А.* Дзейнасць Маскоўскага і Санкт-Пецярбургскага аддзяленняў Саюза раўнапраўя жанчын у гады Першай расійскай рэвалюцыі ........ 10
*Крывіцкая К.В.* Камісія Часовага ўрада Вялікага княства Літоўскага: стварэнне і склад ........ 13
*Зданкевіч К.В.* Судовая рэформа 1864 г. у Беларусі: гістарыяграфія праблемы ........ 16
*Кадзіра У.М.* Прыгонніцкі ўціск і антыфеадальная барацьба беларускага і ўкраінскага народаў у другой палове XVI – 30-я гг. XVII ст.: аналіз археаграфіі ........ 19
*Люты А.М., Кадзіра У.М.* Генезіс і эвалюцыя казацтва Вялікага Княства Літоўскага ў канцы XV – XVI ст. ........ 21
*Вялікі А.Ф.* Беларуска-польскія ўзаемаадносіны ў знешняй палітыцы СССР у сярэдзіне 40 – другой палове 50-х гг. XX ст. ........ 25
*Важнік В.М.* Эканамічныя, навукова-тэхнічныя і культурныя сувязі БССР і ПНР у 1949–1979 гг. ........ 29
*Гайдукевіч Л.М.* Малыя гістарычныя гарады як аснова развіцця турызму ў рэгіёнах Беларусі ........ 32
*Старычонак В.В.* Месца амерыканскай грамадскай думкі і Кангрэса ЗША ў адносінах да пытання аб прымяненні Злучанымі Штатамі сілы ў 1990–1995 гг. ........ 36
*Субоцін А.Г.* «Імперская рэформа» ў Трэцім рэйху (1933–1934 гг.) .... 42

## Філасофія

*Красюк У.Ф.* Макс Планк на фоне эпохі ........ 46
*Шымбалёў А.А.* Астралогія і рэпрэзентацыя рэальнасці ........ 48
*Стаховіч Т.В.* Эстэтычныя пошукі ў творчасці кампазітара Вячаслава Кузняцова ........ 52

## Паліталогія

*Сіманоўскі С.І.* Артыкуляцыя інтарэсаў у палітычнай сістэме грамадства ........ 57
*Скок Н.У.* Палітычная культура: узроўні і структура ........ 61
*Юройць К.П.* Фарміраванне беларускай нацыянальнай ідэі канцы XIX – першай чвэрці XX ст. ........ 63
*Новікава С.І.* Развіццё ідэй і ўяўленняў аб праве і справядлівасці: д антычнасці да праектаў сацыялістаў-утапістаў ........ 67

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Такім чынам, неглядзячы на тое, што казацтва ў канцы XV–XVI ст. было разнародным па нацыянальным, сацыяльным і маёмасным складзе, яно было вельмі ўплывовай палітычнай ваеннай сілай. Рэестр быў не толькі войскам, але і своеасаблівым саслоўем феадальнага грамадства з рысамі, якія толькі яму характэрны. Акрамя таго, рэестравае войска займала асобную тэрыторыю і карысталася самакіраваннем, іншымі словамі, мела абмежаваную аўтаномію. У даследуемы перыяд казацтва з'яўлялася ўдзельнікам, арганізатарам узброенай антыфеадальнай барацьбы ў ВКЛ, а пасля 1569 г. і ў Рэчы Паспалітай.

*Літаратура і крыніцы*

1. Kronika Marcina Bielskiego. – T. II. – Kn. 4–5. – Sanok, 1856. – S. 882.
2. Сборник РИО. – СПб., 1882. – Т. 35. – С. 23; *Клепатский, П.Г.* Очерки по истории Киевской земли / П.К. Клепатский. – Одесса, 1912. – С. 349.
3. Літоўская Метрика. – Кн. 5. – Вильнюс, 1993. – С. 66.
4. *Грушевский, М.* Історія України – Руси / М. Грушевский. – Київ, 1995 – Т. 7. – С. 77–82, 83.
5. Сборник РИО. – СПб., 1882. – Т. 35. – С. 290.
6. Історія українського козацтва. Нариси у двоих томах. – Т. 1. – Київ, 2006. – 800 с.
7. *Похилевич, Д.Л.* Белорусское казачество / Д.Л. Похилевич // Наукові записки Львівського Державного університету імені Івана Франка. – Т. XIII. Серія історична. Вип. 6. – Львів, 1957. – С. 148–149.
8. *Raba Joel.* Between Remembrance and Denial: The Fate of the Jews in the Wars of the Polish Commonwealth during the Mid-Seventeenth Century as Shown in Contemporary Writings and Historical Research. Boulder, Colo., 1995. – P. 104.
9. *Литвин, М.* О правах татар, литовцев и москвитян / М. Литвин. – М., 1994. – С. 9–11.
10. Мемуары, относящиеся к истории Южной Руси. Вып. 2. – Киев, 1896. – С. 295.
11. *Raba Joel.* Between Remembrance and Denial. P. 98.
12. История Украинской ССР. Т. 2. – К., 1982. – С. 177.
13. Архив ЮЗР. Ч. 7. Т. 2. Киев, 1890. – С. 367. (Архив Юго-Западной Руси).
14. *Литвин, М.* О правах татар, литовцев и москвитян / М. Литвин. – М., 1994. – С. 63.
15. Архив ЮЗР. Ч. 7. Т. 2. Киев, 1886. – С. 103.
16. Акты, относящиеся к истории Западной Руси (АЗР). – Т. 1. – Спб., 1846. – С. 194.
17. Архив ЮЗР. Ч. 7. Т. 2. – Киев, 1886. – С. 194.
18. Kronika M. Bielskiego. – T. 3. – Sanok, 1856. – S. 1358.
19. Acta Tomiciana. T. 16 – S. 366; Kronika Marcina Bielskiego. – Skiedo. T. II. – S. 1059. (Acta Tomiciana. T. 6 –S. 1857. – Poznan, 1868. – S. 366).
20. Центральный государственный исторический архив Украины (ЦГИА Украины). Фонд. КМФ. 36. – Оп. 1. – Д. 7. – Л. 948 [Ліст караля і вялікага князя Сігізмунда I панам – радзе за 1524 г.].
21. Акты ЮЗР. – СПб., 1865. – Т. 2. – С. 176.
22. Acta historika res gestas Poloniae illustrantia. – Krakow, 1887. – T. 11. – S. 337.
23. Історія українського козацтва. Т. 1. – С. – 76.
24. История Украинской ССР. Т. 2. – С. 248–249.
25. Історія українського козацтва. Т. 1. – С. – 77.
26. Селянський рух на Україні 1569–1647 рр. – К., 1993. – С. 345.

SUMMARY

*The article discusses the period of the Cossack movement which wasn't only the participant, but also the organizer of the armed antifeudal fight in the Great Principality of Lithuania, and after 1569 in Rzecz Pospolita. It held an intermediate social status between the gentry and peasantry, as a first one reacted to the changes in social, political and economic situation. The authors define the historic role of the Cossack movement in the late 15th – early 16th centuries. The Cossacks contributed to the new land development, the defence and protection of the southern and south-eastern borders of the Great Principality of Lithuania and Russia; they actively took part in antifeudal uprisings and common people wars.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*УДК 947.6:327«194/195»*

***А.Ф. Вялікі,***
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі БДПУ*

## БЕЛАРУСКА-ПОЛЬСКІЯ ЎЗАЕМААДНОСІНЫ Ў ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫЦЫ СССР У СЯРЭДЗІНЕ 40 – ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 50-х гг. XX ст.

Беларуска-польскія ўзаемаадносны заўсёды з'яўляліся прадметам даследаванняў айчынных гісторыкаў. Гэта невыпадкова, бо пасля Другой сусветнай вайны БССР і Польская Рэспубліка ўстанавілі міждзяржаўныя адносіны як раўнапраўныя суб'екты міжнародных адносін. Да разгляду пытанняў двухбаковых узаемаадносін у адзначаны перыяд звярталіся айчынныя даследчыкі У. Талстой [17], Э. Пазняк [14], А. Ясінскі[21], а таксама расійскія даследчыкі Д. Тамашэўскі [18], Б. Поклад [13], В. Парсаданава [12]. Аднак для іх даследаванняў характэрна асвятленне двухбаковых адносін выключна ў станоўчым плане, ухіленні ад разгляду складаных і спрэчных пытанняў – праблемы Арміі Краёвай (АК), палякаў як нацыянальнай меншасці ў БССР, абмен насельніцтвам паміж БССР і Польшчай у 1944–1946 гг. і рэпатрыяцыю палякаў з БССР у ПНР і інш. Адыход ад асвятлення беларуска-польскіх адносін выключна ў рэчышчы савецка-польскіх, разгляд праблемных аспектаў храктэрны для прац У. Снапкоўскага [15–16], В. Шадурскага [19], Ю. Вашкевіча [7], В. Важнік [6]. Сярод прац польскіх гісторыкаў у першую чаргу неабходна адзначыць даследаванні Я. Міper Міpановіча [27–28], П. Эберхардта [25], М. Рухневіч [29], Я. Чарнікевіча [24], у якіх фрагментарна і тэзісна асвятляюцца ўзаемаадносіны дзвюх рэспублік. Разам з тым адзначым, што вышэйзгаданыя ды іншыя даследчыкі не на-

давалі значнай увагі развіццю двухбаковых узаемаадносін. Мэта дадзенага артыкула – разгляд дынамікі беларуска-польскіх узаемадачыненняў у сярэдзіне 40 – 50-х гг. XX ст., а таксама прычын, якія ўплывалі на іх актывізацыю ці заняпад.

Беларуска-польскія ўзаемаадносіны магчыма падзяліць на два кардынальна розныя перыяды: першы – 1944–1955 гг., другі – 1955–60-я гг. Першы перыяд характарызуецца кароткатэрміновай актыўнасцю ў 1944–1947 гг., а потым глыбокім спадам і звядзеннем да мінімуму двухбаковых стасункаў. Пачатак актыўным двухбаковым узаемаадносінам паміж БССР і Польскай Рэспублікай быў закладзены ў 1944 г., калі, паводле Закона ВС СССР «Аб прадастаўленні саюзным рэспублікам паўнамоцтваў у галіне знешніх зносін і аб пераўтварэнні ў сувязі з гэтым народнага камісарыята замежных спраў з агульнасаюзнага ў саюзна-рэспубліканскі народны камісарыят», БССР атрымала права ўступаць у непасрэдныя зносіны з замежнымі дзяржавамі, заключаць з імі пагадненні і абменьвацца дыпламатычнымі і консульскімі прадстаўніцтвамі. Пачатак узаемаадносін паміж дзвюма краінамі пачаўся з падпісання беларуска-польскага пагаднення аб узаемнай эвакуацыі беларускага, рускага і ўкраінскага насельніцтва з Польшчы ў БССР, а польскага і яўрэйскага з Беларусі ў Польшчу [8, с. 52]. Беларуска-польскім пагадненнем Крэмль зацвярджаў на міжнароднай арэне ў якасці паўнапраўных суб'ектаў міжнародных адносін і Польскі камітэт нацыянальнага вызвалення (ПКНВ) і БССР, бо і для ПКНВ як часовага ўрада і для Беларусі гэтае пагадненне з'яўлялася першым міжнародна-прававым актам, з якім павінна была лічыцца міжнародная супольнасць.

У пагадненне неаднаразова ўносіліся дапаўненні і змяненні. Гэта тлумачыцца тым, што ўрады Беларусі і Польшчы дапусцілі шэраг сур'ёзных пралікаў пры яго падрыхтоўцы, што абумоўлівала неабходнасць ўнясення паправак. Так, пагадненне ад 9 верасня 1944 г. прадугледжвала, што перасяленне павінна было пачацца 15 кастрычніка 1944 г. і скончыцца 1 лютага 1945 г. Аднак у студзені 1945 г. стала відавочным, што ў вызначаны тэрмін (да 1 лютага 1945 г.) не ўдасца зарэгістраваць і перасяліць у Польшчу ўсіх жадаючых з-за іх вялікай колькасці. Улічваючы сітуацыю, якая склалася, 26 студзеня 1945 г. Старшыня СМ Польшчы Э. Асубка-Мараўскі накіраваў Старшыні СНК БССР П. Панамарэнку Ноту, у якой прапаноўвалася прадоўжыць тэрмін перасялення да 1 мая 1945 г. [11, л. 67]. Беларускі бок, разгледзеўшы прапанову палякаў, пагадзіўся «прадоўжыць да 1 мая 1945 г. эвакуацыю беларускага насельніцтва з тэрыторыі Польшчы і польскіх грамадзян з тэрыторыі БССР» [11, л. 69]. Аналізуючы перапіску П. Панамарэнкі і Э. Асубкі-Мараўскага, неабходна адзначыць, што без дазволу ўрада СССР урад Беларусі не мог самастойна прыняць такое рашэнне. Гэта пацвярджае ліст наркама замежных спраў БССР К. Кісялёва, накіраваны 11 студзеня 1945 г. В. Молатаву, у якім ён прасіў урад СССР «разгледзець і прыняць адпаведнае рашэнне па пытанні дадатковага пагаднення паміж урадамі БССР і ПКНВ аб эвакуацыі беларускага насельніцтва з тэрыторыі Польшчы і польскіх грамадзян з тэрыторыі БССР» [11, л. 1]. Толькі атрымаўшы дазвол Цэнтра, урад Беларусі даў палякам згоду на прадаўжэнне перасялення.

Улічваючы, што не ўсе палякі паспелі зарэгістравацца на выезд у Польшчу да 1 мая 1945 г., урад Польшчы прапанаваў ураду БССР сустрэцца ў Варшаве і падпісаць дадатковы пратакол аб прадаўжэнні перасялення [11, л. 148]. Беларуская дэлегацыя, якую ўзначальваў намеснік Старшыні СНК БССР А. Шаўроў, прыбыла ў Варшаву. 24 лістапада ў савецкім пасольстве адбыліся беларуска-польскія перамовы, у якіх з польскага боку прымалі ўдзел Старшыня СМ Польшчы Э. Асубка-Мараўскі, віцэ-міністр, Генеральны ўпаўнаважаны польскага ўрада па справах рэпатрыяцыі А. Вольскі і Галоўны ўпаўнаважаны польскага ўрада па справах эвакуацыі ў Беларусі С. Вішнеўская [11, л. 119]. Асноўнымі пытаннямі, якія абмяркоўвалі бакі, з'яўляліся наступныя: прадаўжэнне тэрміну рэгістрацыі да 31 студзеня 1946 г., стварэнне спрыяльных умоў для ад'езду тых, хто ўжо зарэгістраваўся, дазвол на перасяленне ў Польшчу татар і караімаў, якія раней з'яўляліся грамадзянамі Польшчы. Перамовы ішлі цяжка, асабліва спрэчнымі з'яўляліся першае і трэцяе пытанні. Польская дэлегацыя настойвала на прадоўжанні тэрміну рэгістрацыі да 31 студзеня 1946 г. Беларускі бок заняў жорсткую пазіцыю і настаяў, каб рэгістрацыя была прадоўжана толькі да 15 студзеня 1946 г. [11, л. 120]. Спрэчкі выклікала вылучанае польскім бокам пытанне аб бесперашкоднымвыездзе ў Польшчу татар і караімаў. Беларуская дэлегацыя адхіліла гэтыя патрабаванні польскага боку, якія нібыта не мелі дачынення да перасялення палякаў з БССР у Польшчу. Спрэчным з'яўлялася пытанне аб рабоце прадстаўніцтва СНК БССР у Лодзі. У сувязі з тым, што яно пачало працаваць без згоды з польскім бокам, палякі патрабавалі яго закрыцця. Беларуская дэлегацыя, улічыўшы абгрунтаванае патрабаванне палякаў, пагадзілася з імі. Астатнія пытанні былі вырашаны па абаюднай згодзе, і 25 лістапада 1945 г. Старшыня Савета Міністраў Польшчы Э. Асубка-Мараўскі і намеснік Старшыні СНК БССР А. Шаўроў падпісалі дадатковы пратакол аб прадаўжэнні тэрміну перасялення да 15 чэрвеня 1946 г. [11, л. 120].

Двухбаковыя ўзаемаадносіны, кантакты на вышэйшым міждзяржаўным узроўні закладвалі падмурак для іх далейшага паглыблення і пашырэння. Лагічным крокам у дадзеным накірун-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ку стала б адкрыццё консульства Польскай Рэспублікі ў БССР, аб чым хадайнічаў польскі бок. Аднак гэтую прапанову польскага ўрада не жадала рэалізаваць на практыцы савецкае кіраўніцтва. Але і адмовіць палякам было няёмка, таму СНК СССР 6 ліпеня 1945 г. прыняў пастанову аб неабходнасці адкрыцця савецкіх консульстваў у Познані, Кракаве і Гданьску, а польскіх – у Кіеве, Мінску, Вільні [15, с. 83]. Аднак у выдадзеным у 1974 г. сумесным савецка-польскім зборніку дакументаў замест слова «дыпламатычных» устаўлена слова «дэмакратычных». У выніку падмены атрымалася, што палякі імкнуліся «да ўстанаўлення непасрэдных дэмакратычных адносін» з Украінай, Беларуссю, Літвой [15, с. 83].

Разам з тым у сярэдзіне 40 – 50-х гг. палякі ўсе ж не гублялі надзеі на адкрыццё польскага консульства ў Мінску. Актыўную пазіцыю па гэтым пытанні займала польскае пасольства ў Маскве і міністэрства замежных спраў Польшчы ў сярэдзіне 1947 г. Так, 12 чэрвеня гэтага года пасол Польскай Рэспублікі ў СССР М. Нашкоўскі сустрэўся ў МЗС СССР з міністрам замежных спраў Савецкага Саюза В. Молатавым і падчас размовы з ім прапанаваў адкрыць консульства Польшчы ў Мінску. У справаздачы аб размове з В. Молатавым, накіраванай у МЗС Польшчы, М. Нашкоўскі з надзеяй паведамляў, што «ён (Молатаў. – *А.В.*) прыхільна аднёсся да гэтай прапановы і абяцаў яе разгледзець» [22, k. 5]. 19 чэрвеня саветнік польскага пасольства ў Маскве А. Юшкевіч пры сустрэчы з кіраўніком IV Еўрапейскага аддзела МЗС СССР А. Аляксандравым зноў закрануў гэта пытанне. А. Аляксандраў адказаў, што прапанова польскага боку накіравана ў МЗС Беларусі і, у прынцыпе, урад СССР не бачыць перашкод для стварэння генконсульства [22, k. 9]. Настойлівасць палякаў пачала раздражняць Маскву, і ў жніўні 1947 г. ім далі зразумець, што яны марна спадзяюцца на адкрыццё ў Мінску генконсульства. 19 жніўня М. Нашкоўскі зноў сустрэўся з А. Аляксандравым, які на запыт польскага пасла аб консульстве нічога канкрэтнага не адказаў, але падкрэсліў, што ўрад СССР не супраць адкрыцця консульства ў Мінску. Разам з тым А. Аляксандраў адзначыў, што адкрыццё консульства ў Мінску затрымліваецца з-за тэхнічных прычын, бо «ў разбураным Мінску не маецца адпаведнага памяшкання для консульства» [22, k. 41]. Для вопытнага дыпламата, якім з'яўляўся М. Нашкоўскі, гэтыя словы значылі, што спадзявацца на адкрыццё консульства ў Мінску не выпадае. У наступныя гады зразумеўшы, што адкрыць консульства ў Мінску не ўдасца, палякі так актыўна гэтае пытанне перад кіраўніцтвам МЗС СССР не ставілі. Аднак у штогадовых справаздачах пасольства Польшчы ў СССР заўсёды падкрэслівалася, што «і па цяперашні час застаецца актуальным адкрыццё консульства ў Беларускай ССР» [23, k. 43].

Палітычная «адліга» і ўстанаўленне больш адкрытых адносін з краінамі «народнай дэмакратыі» актуалізавала пытанне аб адкрыцці консульства ў Мінску. Польскае пасольства ў Маскве падрыхтавала падрабязную службовую запіску «Справа стварэння консульства ў Мінску», у якой абгрунтоўвала яго неабходнасць [30, s. 44]. Аднак, нягледзячы на хрушчоўскую «адлігу» у сярэдзіне 40 – другой палове 50-х гг., саюзнае кіраўніцтва адмовіла палякам у адкрыцці консульства ў Мінску.

Пасля завяршэння абмену насельніцтвам (1944–1946 гг.) наступае рэзкі спад у беларуска-польскіх узаемаадносінах. У першую чаргу гэта абумоўлівалася тым, што пры І. Сталіне не развіваліся і не пашыраліся сувязі паміж партыйна-дзяржаўнымі ўстановамі, грамадскімі арганізацыямі СССР–БССР і краінамі «народнай дэмакратыі» (уваходзіла і Польшча) на мясцовым, рэгіянальным і міжасабовым узроўнях. Да сярэдзіны 50-х гг. галоўнай формай узаемаадносін з'яўляўся абмен культурнымі каштоўнасцямі, навуковай літаратурай. Так, у ліпені 1947 г. палякі перадалі Беларусі фотакопіі і мікрафільмы твораў беларускай літаратуры, якія знаходзіліся ў польскіх бібліятэках [10, с. 64]. У той жа час, у жніўні гэтага года беларускі бок перадаў Польшчы помнікі польскай гісторыі і культуры, выяўленыя на тэрыторыі Беларусі ў першыя пасляваенныя гады [10, с. 71].

Новы этап звязаны з палітычнымі рэформамі, у тым ліку і ў сферы міжнародных адносін, якія пачаліся ў СССР з прыходам да ўлады М. Хрушчова. Пераломным у развіцці беларуска-польскіх адносін стаў 1955 г., калі ў БССР праходзіў месячнік польска-савецкай дружбы. Адзначым, што на працягу месячніка рэспубліканскія сродкі масавай інфармацыі надрукавалі 96 артыкулаў па польскай праблематыцы, чаго ніколі раней не назірался. Таму сярэдзіну 50-х гг. магчыма разглядаць як пачатак якасна новага этапа ў развіцці беларуска-польскіх адносін, які характарызуецца іх пашырэннем і паглыбленнем. У гэты час узнікла, пачало развівацца і стала неад'емнай часткай двухбаковых адносін рэгіянальнае супрацоўніцтва прыгранічных абласцей Беларусі і ваяводстваў Польшчы. Так, калі ў 1956 г. бюро ЦК КПБ разглядзела толькі тры пытанні, што датычылі сувязей Брэсцкай і Гродзенскай абласцей з Беластоцкім і Люблінскім ваяводствамі [9, с. 196], то ў 1957 г. бюро ЦК КПБ на сваіх пасяджэннях 8 раз [9, с. 196], а сакратарыят ЦК тройчы разглядаў аналагічнага кшталту пытанні [9, с. 196]. Такім чынам, у 1957 г. бюро і сакратарыят ЦК КПБ на сваіх пасяджэннях 11 раз разглядалі пытанні, звязаныя з беларуска-польскай праблематыкай. У 1958 г. гэта колькасць значна павялічылася. Так, на сакратарыяце ЦК КПБ 8 разоў [9, с. 196], а на бюро 9 разоў разглядаліся аналагічнага кшталту пытанні

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

[9, с. 196]. Такім чынам, у 1958 г. вышэйшыя партыйныя органы Беларусі 17 раз абмяркоўвалі і разглядалі пытанні, звязаныя з накіраваннем перавважна ў Беластоцкае ды Люблінскае ваяводствы рознага кшталту дэлегацый.

Акрамя прыгранічнага супрацоўніцтва пачалі пашырацца кантакты на вышэйшым партыйна-дзяржаўным узроўнях. Так, 12–14 снежня 1957 г. у БССР знаходзіўся з візітам пасол ПНР у СССР Т. Гедэ, якія сустрэўся і правёў перамовы з шэрагам высокапастаўленых дзяржаўных асоб – Старшынёй СМ БССР М. Аўхімовічам (10 снежня), старшынёй Мінскага гарвыканкама В. Шарапа (11 снежня), намеснікам Старшыні Прэзыдыума ВС БССР Ф. Сурганавым (12 снежня), на якіх закраналіся пытанні актывізацыі і пашырэння двухбаковых адносін: прыгранічнага супрацоўніцтва, рэпатрыяцыі палякаў з БССР у ПНР, эканамічнага і культурнага супрацоўніцтва і г. д. [1, л. 12].

У красавіку 1958 г. адбыўся візіт партыйна-ўрадавай дэлегацыі СССР у Польшчу, у склад якой уваходзіў першы сакратар ЦК КПБ К. Мазураў [3, с. 3]. Частка дэлегацыі, якую ўзначальваў К. Мазураў, наведала Познань, дзе ён выступіў на ўрачыстым пасяджэнні, прысвечаным падпісанню польска-савецкага Дагавора аб сяброўстве, узаемнай дапамозе і пасляваенным супрацоўніцтве і 85-ці годдзю з дня нараджэння У.І. Леніна.

Пікам беларуска-польскіх узаемаадносін канца 50-х гг. з'явіўся візіт польскай партыйна-ўрадавай дэлегацыі на чале з першым сакратаром Польскай Аб'яднанай Рабочай Партыі (ПАРП) У. Гамулкам у Беларусь, які праходзіў з 1 па 2 лістапада 1958 г. Прэса Беларусі вельмі шырока асвятляла гэты візіт. «Нех жые Пшыязнь», – пад такім загалоўкам з'явілася ў «Советской Белоруссии» перадавіца, у якой, у прыватнасці, падкрэслівалася, што «[...] у сваёй прамове У. Гамулка назваў беларускі народ блізкім і добрым суседам [4, с. 1]. Разам з палякамі ў БССР прыехалі і маскоўскія «куратары» – член Прэзідыума ЦК КПСС А. Кірычэнка, намеснік Старшыні Прэзідыума ВС СССР М. Тарасаў, намеснік міністра замежных спраў СССР М. Фірубін, пасол СССР у Польшчы П. Абрасімаў, загадчык аддзела ЦК КПСС Ю. Андропаў, загадчык 4 Еўрапейскім аддзела МЗС СССР А. Гарчакоў і іншыя члены апарата ЦК КПСС і МЗС СССР [5, с. 1]. Магчыма меркаваць, што яны прыехалі ў Беларусь для таго, каб трымаць пад кантролем візіт палякаў і двухбаковыя беларуска-польскія перамовы. У сувязі з гэтым неабходна пагадзіцца з меркаваннем беларускага гісторыка У. Снапкоўскага, што «візіты партыйна-ўрадавых дэлегацый сацыялістычных краін у рэспубліку не мелі самастойнага значэння», а [...] замежныя госці з «брацкіх краін сацыялізму» знаёміліся з вопытам сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця беларускага народа ў многіх галінах грамадскага жыцця, савецкім вопытам дзяржаўнага і партыйнага кіраўніцтва» [16, с. 192–193]. Гэта поўнасцю адносілася і да візіту партыйна-ўрадавай дэлегацыі ПНР у Беларусь.

У знешнепалітычнай дактрыне Масквы Польшча як адна з «краін народнай дэмакратыі» займала важнае месца. Беларусі, паколькі яна мяжавала з Польшчай, у гэтай дактрыне адводзілася толькі другасная роля. Беларуска-польскія ўзаемаадносіны, знаходзячыся пад поўным кантролем Масквы, залежалі ад стану і дынамікі развіцця беларуска-польскіх адносін. Выпрацаваныя ў Цэнтры формы савецка-польскага супрацоўніцтва: «абмены вопытам», «дні», «дэкады», месячнікі», «сустрэчы», «паездкі» і г. д. поўнасцю пераносіліся і на беларуска-польскія ўзаемаадносіны. Аднак гэта вяло да фармалізацыі, закасцянеласці ды фрагментарнасці беларуска-польскіх сувязей. Ідэалагемы аб «непарушнасці савецка-польскага сяброўства» і «савецка-польскай прыязні» не пакідалі месца для паглыблення двухбаковых адносін паміж БССР і Польшчай, абмеркавання і пошукаў рашэння важных пытанняў беларуска-польскіх этнанацыянальных узаемадносін: рэпатрыяцыі палякаў з Беларусі ў Польшчу ў 1955–1959 гг.; палякаў як нацыянальнай меншасці ў Беларусі і беларусаў у Польшчы; адкрыцця консульства ПНР у БССР; дзейнасці Рымска-каталіцкага касцёла; салдат арміі Андэрса і ўдзельнікаў польскага падполля (АК) і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Літаратура і крыніцы


1. Архіў Міністэрства замежных спраў РБ. – Фонд. 907. – Воп. 1. – Спр. 2.
2. БЕЛТА. Сердечная встреча делегации Польской Народной Республики в столице Белорусской ССР // Советская Белоруссия. – 1958. – 2 нояб. – С. 1.
3. БЕЛТА. Пребывание К.Е. Ворошилова в Польской Народной Республике // Советская Белоруссия. – 1958. – 24 апр. – С. 3.
4. БЕЛТА. «Нех жие пшиязнь» // Советсkя Белоруссия. – 1958. – 1 нояб. – С. 1.
5. БЕЛТА. Пребывание делегации Польской Народной Республики в Минске // Советсkя Белоруссия. – 1958. – 2 нояб. – С. 3.
6. *Важник, О.Н.* БССР и Польская Народная Республика: экономические, научно-технические и культурные связи в 1949–1979 гг.: автореф... дис. канд ист. наук: 07.00.15. / О.Н. Важник. – Минск, 2005. – 21 с.
7. *Вашкевіч, Ю.* Беларуска-польскія культурныя сувязі ў 1945–1991 гг. / Ю. Вашкевіч. – Мінск: Тэсей, 2004. – 184 с.
8. *Вялікі, А.Ф.* На раздарожжы. Беларусы і палякі ў час перасялення (1944–1946 гг.): манаграфія / А.Ф. Вялікі; навук. рэд. В.Дз. Селяменеў. – Мінск: БДПУ, 2005. – 319 с.
9. *Вялікі, А.Ф.* Беларусь – Польшча ў XX стагоддзі. Невядомая рэпатрыяцыя. 1955–1959 гг. / А.Ф. Вялікі; навук. рэд. В.Дз. Селяменеў. – Мінск: БДПУ, 2007. – 272 с.
10. Документы и материалы по истории советско-польских отношений. Т.Х. январь 1950 г. – декабрь 1955 г. / ред. кол.: сов. часть – И.А. Хренов (отв. ред.) [и др.], польская часть – Т. Цесляк (отв. ред.) [и др.]. М.: Наука, 1980. – 551 с.
11. Нацыянальны Архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд. 788. – Воп. 1. –Спр. 10. Дакладныя запіскі і перапіска з урадам

СССР і Польшчы аб ходзе эвакуацыі. 11 студз. 1945 г. – 31 снеж. 1945 г.
12. Парсаданова, В.С. Советско-польские отношения в годы Великой Отечественной войны. 1941–1945 гг. / В.С.Парсаданова. – М; 1990. – 191 с.
13. Поклад, Б.И. Внешняя политика народной Польши / Б.И. Поклад. – М.: Междунар. отношения, 1978. – 256 с.
14. Пазняк, Э. Суседзі і браты / Э. Пазняк. – Мінск: Беларусь, 1970. – 112 с.
15. Снапкоўскі, У.Е. Знешнепалітычная дзейнасць Беларусі. 1944–1953 гг. / У.Е. Снапкоўскі; пад рэд. Ю.П. Броўкі. – Мінск: Бел. навука, 1977. – 207 с.
16. Снапкоўскі, У.Е. Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі: вучэб. дапам. для студ. фак. міжнар. адносін. У 2 ч. Ч. 2. Ад канца XVIII да пачатку XXI ст. / У.Е. Снапкоўскі. – Мінск: БДУ, 2004. – 303 с.
17. Толстой, В.С. Братское сотрудничество белорусского и польского народов. 1944–1964 / В.С. Толстой. – Минск: Наука и техника, 1966. – 135 с.
18. Томашевский, Д.Г. Внешняя политика Польской Народной Республики / Д.Г. Томашевский. – М.: Ин-т междунар. отношений, 1963. – 88 с.
19. Шадурский, В.Г. Культурные связи Беларуси со странами Центральной и Западной Европы (1945–1990-е годы) / В.Г. Шадурский. – Мінск БГУ, 2000. – 285 с.
20. Эберхардт, П. Дэмаграфічная сітуацыя на Беларусі: 1889–1989 / П. Эберхардт. – Менск: Бел. фонд Сораса, 1997. – 277 с.
21. Ясінскі, А. Сябры-інтэрнацыяналісты / А. Ясінскі. – Мінск: Беларусь, 1973. – 174 с.
22. Archiwum Ministerstwa Spraw Zagranicznych (AMSZ) RP. Z. 6, t. 521, w. 33, k. 1–2. Wydzial radziecki, notatki z rozmow dyplomatow polskich w Moskwie z przedstawicelami MSZ ZSRR. 1947.
23. Z. 20, t. 71, w. 5, k. 43. Biuro konsularne w Moskwe. 1949.
24. Czerniakiewicz, J. Czernikiewicz, M Przesiedlenia ze Wschodu 1944–1959 / J. Czerniakiewicz, M, Czernikiewicz. – Warszawa Wyd. Wyszszej Szkoly Pedagogicznej UWP. 2007. – 157 s.
25. Eberhardt, P. Polska i jej granice. Z historii Polskiej geografii politycznej / P. Eberhardt, Wyd. Uniwersitetu Marii Curie-Skladowskiej. – Lublin, 2004. – 302 s.
26. Kowalski, W. Walka dyplomatyczna o miejsce Polski w Europe (1939–1945) / W. Kowalski, Wyd. Drugie rozsszerone. Wyd. Ksizka i Wiedza. – Warszawa, 1967. – 798 s.
27. Mironowicz E. Polityka narodowosciowa PRL / E. Mironowicz, Bialystok. – T-wo Hist., 2000. – 284 s.
28. Mironowicz, E., Tokc, S., Radzik, R. Zmiany struktury narodowosciowej na pograniczu polsko-bialoruskim w XX wieku. / E. Mironowicz, S. Tokc, R. Radzik. Wyd. Uniwersitety w Bialymstoku. – Bialystok, 2005. – 171 s.
29. Ruchniewicz, M. Repatriacja ludnosci polskiej z ZSRR w latach 1955–1959 / M. Ruchniewicz. – Warszawa, 2000. – 402 s.
30. Szumski, J. Z historii utworzenia placowek dyplomatycznych w BSRR (w swietle dokumentow archiwum MSZ RP) / J. Szumski // Magazyn Polski. – 2005. – № 2. – S. 42.

SUMMARY

*The article is dedicated to the development of belarusian-polish interrelation in the middle of 40-ies and the at end of 50-ies in foreign policy of the Soviet Union which has not been studied sufficiently in belarusian historiography. In the article the author analyses the dynamics of this interrelation, shows two periods of it and influence of the Kremlin on the bilateral belarusian-polish relations and interrelations.*

*УДК 947.6:327«1949/1979»*

**В.М. Важнік,**
*кандыдат гістарычных навук, загадчык кафедры дадатковай педагагічнай адукацыі ІПК і ПК БДПУ*

## ЭКАНАМІЧНЫЯ, НАВУКОВА-ТЭХНІЧНЫЯ І КУЛЬТУРНЫЯ СУВЯЗІ БССР І ПНР У 1949–1979 гг.

Пасля Другой сусветнай вайны большая частка міжнародных кантактаў БССР ажыццяўлялася з еўрапейскімі сацыялістычнымі краінамі, сярод якіх значнае месца займалі беларуска-польскія сувязі. Вывучэнню асобных пытанняў двухбаковага супрацоўніцтва БССР і ПНР у пасляваенны перыяд былі прысвечаны працы беларускіх навукоўцаў У. Талстога [1–2], Э. Пазняка [3], А. Ясінскага [4–5]. Кірункі і формы замежных сувязей у 1990–2000-я гг. разглядаліся В. Шадурскім [6–8], У. Снапкоўскім [9–10]. Значны ўклад у вывучэнне дзейнасці Таварыства польска-савецкай дружбы ўнёс Л. Лойка [11]. У 2006 г. была выдадзена манаграфія старшыні таварыства Польшча-Беларусь Б. Жыльніцкага «Таварыства Польшча-Беларусь за добрасуседства абодвух народаў», у якой даследуюцца ўмовы і мэты стварэння грамадскай арганізацыі, змест і характар яе дзейнасці па ўмацаванні адносін добрасуседства і супрацоўніцтва паміж Польшчай і Беларуссю [12].

Аналіз айчынных даследаванняў 1950–2006 гг. сведчыць аб тым, што нягледзячы на значную колькасць прац, прысвечаных міжнароднаму супрацоўніцтву БССР, увага асобным аспектам двухбаковых беларуска-польскіх эканамічных, навукова-тэхнічных і культурных сувязей, сістэматызаванаму, абагульняльнаму вывучэнню праблем у храналагічных рамках 1949–1979 гг. удзелена не была. Такім чынам, комплексныя работы па гэтай актуальнай і цікавай праблеме адсутнічаюць. У літаратуры адбываўся або разгляд палітычных аспектаў савецка-польскіх адносін, або ілюстрацыйны выклад розных форм двухбаковага супрацоўніцтва. Пры гэтым важна падкрэсліць, што наяўныя працы не маглі ўтрымліваць матэрыял (і не ўтрымліваюць яго), які супярэчыць афіцыйнай палітыцы. Да таго ж у той час доступ да многіх архіўных матэрыялаў быў закрыты або абмежаваны. Амаль не закрануты такія аспекты, як уплыў ідэалагічнага фактару на развіццё беларуска-польскіх сувязей, узаемадзеянне соцыумаў дзвюх краін, за

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ